# «БЕЛАРУСАМ БУДУ Я ДА СКОНУ»: ТВОРЧАЯ АСОБА ПІСЬМЕННІКА ВАСІЛЯ ФІЛІПОВІЧА

*Аляксандрава В.В., Крываносава М.А., Малец А.А.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – старшы выкладчык*

Расказваецца пра жыццёвы і творчы шлях беларускага паэта Васіля Філіповіча. Прадстаўлены асноўныя рысы яго характару як творчай асобы, прааналізавана тэматыка творчасці, якая адзначаецца глыбокай эмпатыяй да людскіх перажыванняў і шчырым адлюстраваннем беларускай душы, клопатам пра Радзіму і родную мову.

Кожны куточак Беларусі славіцца таленавітымі людзьмі. Васіль Міхайлавіч Філіповіч – паэт, пісьменнік, празаік і перакладчык з Віцебшчыны, які нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Туркова Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Спачатку жыў з бацькамі ў роднай вёсцы, потым – у Дзюне, а ў 1959 годзе сям'я пераязджае ў Наваполацк. Паэтычны талент праявіў ужо ў дзяцінстве. Васіль Філіповіч быў у ліку заснавальнікаў літаратурнага аб'яднання "Крыніцы".

Працоўную дзейнасць В. Філіповіч пачаў на нафтаперапрацоўчым заводзе ў Наваполацку. Пасля службы ў арміі чатырнаццаць гадоў пражыў з сям'ёй у Мазыры. Потым было сямігадовае развітанне з роднай Беларуссю, таму што лёс закінуў яго ў Малдавію, дзе працаваў на металургічным заводзе. Але там не застаўся, бо пацягнула да родных мясцін, у Беларусь.

Паэт вярнуўся ў Наваполацк у 1993 годзе. Са жніўня гэтага ж года – сябра літаратурнага аб'яднання "Полоцкая ветвь". У гэтым жа годзе выходзіць у свет калектыўны паэтычны зборнік "Паварот", адным з аўтараў якога быў Васіль Філіповіч. Праз некаторы час пры падтрымцы Давіда Сімановіча, Алега Салтука і Навума Гальпяровіча з-пад пяра Васіля Міхайлавіча выходзяць чатыры зборнікі на рускай і беларускай мовах. І ў кожным з іх – любоў да сваёй роднай зямлі.

Васіль Філіповіч – унікальны паэт, якому цікава ўсё. Таму і паэзія яго здзіўляе шматфарбнасцю і разнастайнасцю тэматыкі. Яго вершы, напісаныя і для дзяцей, і для дарослых, заўсёды чытаюцца з цікавасцю, бо яны ідуць ад шчырай душы добрага чалавека, які вельмі кахае сваю жонку, любіць сваіх дзяцей і ўнукаў, прысвячае ім свае творы. Сваімі вершамі паэт вучыць з павагай і любоўю адносіцца да сваіх родных:

*Саша, Сашанька,Сашуля,*
*Мілы родненькі сынуля!*
*Толькі зорачкі на ганак,*
*Сніцца мне: вось ты ля школы,*
*Ты дарослы, ты вясёлы.*
*У сваім дзівосным сне,*
*Я, сынок, пад самы ранак*
*Ажаню цябе* [3, С.70]

Любоў да родных мясцін і ўсёй Беларусі, адданасць ёй, цікавасць да гістарычных асоб нашай Радзімы, захапленне прыгажосцю прыроды, клопат аб роднай мове пранізваюць усю творчасць паэта:

*У знаёмым з маленства кутку,*
*Дзе нябёсы цвітуць васількамі,*
*Дзе ў бярозавым светлым гайку*
*Пахне восеньскімі баравікамі,*
*Дзе ў лагчыне трапеча ручай,*
*Дзе красу колас жытні ўбірае –*
*Бог параіў: "Скажы выбачай*
*Шматпакутнаму роднаму краю".*
*А за што выбачацца? Чаму?*
*У самога вясной лёс зімовы.*
*Ды за тое, што цяжка яму*
*Без цяпла роднай матчынай мовы* [3. С.6].

Васіль Філіповіч – чалавек, у якога "замест сэрца – беленькі рамонак", у якога "васільком сінеецца душа", для якога Беларусь – "ненаглядная краіна". Адначасова з гэтым яго хвалюе і лёс роднай мовы. Мы прывыклі, што Радзіму лічым Бацькаўшчынай, а вось Васіль Філіповіч назваў яе вельмі цікава – *матчына*. Значыць, ад маці:

*Пакуль жывыя Ніл Гілевіч,*
*Васіль Зуёнак, Янка Брыль,*
*Дождж іншамоўя – не залева,*
*Вясёлка роднай мовы – быль.*
*Ды песнярам не будзе скону,*
*Не згаснуць зоркам уначы,*

*Бо ёсць у матчыны законы*
*Усё святое берагчы* [3. С.12].

У час працы ў гарадскім Дэпартаменце аховы В. Філіповіч пазнаёміўся і пасябраваў з таленавітым чалавекам – кампазітарам і спеваком Генадзем Гармашам, які працаваў злектраманцёрам ахоўна-пажарнай сігналізацыі. Творчы дуэт гэтых таленавітых людзей юнуе ўжо шмат гадоў. Разам яны стварылі больш за 40 песень. іх сумесная работа ўваходзіць у рэпертуар вакальна-інструментальнага ансамбля "Начная птушка", які неаднойчы быў пераможцам розных конкурсаў. А яго кіраўнік і салют Генадзь Гармаш шматразова станавіўся ўладальнікам Гран-пры рэспубліканскага конкурсу МУС. Гімн наваполацкаму заводу "Палімір" таксама створаны імі.

Самая першая і, напэўна, самая вядомая песня Васіля Філіповіча і Генадзя Гармаша называецца "Вяночак" і даўно ўжо ўключана ў рэпертуар розных самадзейных выканаўцаў і калектываў. Можна сказаць, што гэты твор пайшоў у народ. Генадзь Гармаш успамінаў кур'ёзны выпадак, калі ён аднойчы на гастролях пачуў, як вядучыя аб'явілі песню "Вяночак" народнай. Прысвечана гэта песня Беларусі і яе сімвалу– васільку:

*Адвячоркам чэрвеньскім чырвоным у пару пунцовых васількоў*
*Б'юцца сэрцы маладых няроўна, і пяюць салоўкі пра любоў.*
*Цёплы ветрык гіллейка хістае, месяц ясны ў рыбізне дрыжыць.*
*Ад яго сцяжынка залатая, па якой няспынны час бяжыць.*
*Прыпеў:*
*На бярозцы беленькі кулёк, на дубку – зялёная кашуля.*
*Сімвал Беларусі – васілёк, з васількоў вяночак на матулі.*
*Кажа мне: "І ты вянок надзень, як рукою сум адразу здыме".*
*Любы краю, два разы на дзень кланяецца сонейка Радзіме.*

*Кветкамі, палеткамі, лясамі упрыгожыў Божа мілы край.*
*Сінімі рачнымі паясамі родную зямлю перавязаў.*
*Поплаў, луг, далей – гаёк цяністы, на жытневым полі каласкі.*
*Ў далёкім дарагім дзяцінстве мне былі па пояс васількі.*
*Прыпеў.*

Супрацоўнічалі з Васілём Філіповічам і іншыя кампазітары: С.Анішчанка, В.Малых, С.Хамякоў. Песня "Незачэпа" (музыка С.Хамякова) гучала на фестывалі "Славянскі базар" ў Віцебску.

У час працы над тэмай даследавання мы прааналізавалі 123 творы, а таксама часта сустракалюя з паэтам, больш падрабязна пазнаёмілюя з яго жыццёвым і творчым шляхам, атрымалі незвычайныя ўражанні ад размоў з ім. Асноўная тэма паэзіі Васіля Філіповіча – тэма Радзімы. Аўтар шмат вершаў прысвяціў роднай прыродзе, якую паказвае ў розныя поры года. Таксама паэт звяртае ўвагу на вобразы-сімвалы нашай краіны (васілёк, буслы). Яшчэ адна важная тэма паэзіі В.Філіповіча – родная мова. Паэту крыўдна, што яна становіцца зусім непапулярнай, што моладзь імкнецца больш да замежнага, чым да роднага. Тэме сям'і, кахання таксама адведзена значнае месца.

Васіль Філіповіч для нас – вялікі чалавек. І не толькі таму, што ён піша цудоўныя вершы. Ён добразычлівы, з пачуццём гумару, умее імправізаваць і складаць на хаду маленькія вершыкі, заўсёды гатовы дапамагчы, аддана любіць сваю Радзіму.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. *Радько, Н. В их песне – душа патриота / Н. В. Радько // Новополоцк сегодня. – 2019. – 16 мая*
2. *Усовская, О. Безаварийности, здоровья и благополучия /О.Усовская // Вестник Нафтана.– 2013. - 12 февр.*
3. *Філіповіч, В. Збор твораў. / В. Філіповіч. - Т.1. - Наваполацк, 2015. – 614 с.*
4. *Филипович, В. Поэзия. / В. Філіповіч.- Т.2.- Новополоцк, 2015. – 520 с.*